# ВЕСЦІ

## Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта



2

1998

# Весці

## Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта

**№ 2 (16) 1998**

Штоквартальны навукова-метадычны часопіс
Выдаецца з чэрвеня 1994 г.

## Змест

*Галоўны рэдактар:*
Л. Н. Ціханаў

*Рэдакцыйная калегія:*
Н. Г. Алоўнікава
Г. А. Баўтута
В. А. Бондар (*нам. галоўнага рэдактара*)
А. М. Вітчанка
К. У. Гаўрылавец
А. А. Гіруцкі
А. А. Грымаць
Т. А. Грыгор'ева
І. І. Казімірская
Я. Л. Каламінскі
Л. А. Кандыбовіч
Г. А. Космач
Т. Е. Лемешава (*адказны сакратар*)
М. І. Мішчанчук
І. А. Новік
М. М. Плескацэвіч (*нам. галоўнага рэдактара*)
А. У. Рагуля
М. Т. Стэльмашук
В. М. Фамін
А. Т. Федарук
Л. Б. Шнеперман
У. А. Якавенка
М. С. Яўневіч

### Педагогіка

*Буднікаў Я. Р.* Аб псіхалагічных аспектах фарміравання паняццяў пры навучанні школьнікаў пачаткам матэматычнага аналізу ........ 3

*Гарэлік І. В.* Памылкі студэнтаў пры рашэнні фізічных задач па механіцы ........ 7

*Копысава Н. І.* А. С. Макаранка і яго паслядоўнікі ў эстэтычным выхаванні ........ 12

*Рыжыкава І. І.* Педагагічная перыёдыка аб мэтах прафесійнай педагагічнай дзейнасці (1918-1941 гг.) ........ 22

*Сілівон В. А.* Недыз'юнктыўная прырода творчага працэсу ў маляванні дзіцяці ........ 28

### Дэфекталогія

*Алексіна Л. І., Грыгор'ева Т. А.* Шляхі ўдасканалення навукова-даследчай работы студэнтаў дэфекталагічнага факультэта ........ 35

### Мовазнаўства

*Гируцкий А. А., Гируцкий И. А.* Нейролингвистическое программирование: принципы и проблемы ........ 41

*Васілеўская А. С.* Агульнамоўныя вобразныя азначэнні ў мастацкай прозе Вячаслава Адамчыка . 47

*Зарэцкая Е. В., Мікула Т. Б.* Залежнасць працягласці галосных ад пазіцыйных умоў у нямецкай і беларускай мовах ........ 52

*Конон В. В.* Цветообозначения в романе Д. С. Мережковского "Смерть Богов (Юлиан Отступник)" ........ 60

*Леонтьева В.В.* Бессубъектность и полисубъектность как потенциальные свойства русского предложения ........ 64

Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт БІБЛІЯТЭКА

АРК

*Ратько Т. В.* Синонимические отношения как часть системных отношений в лексике ........ 71

*Чайка Н. У.* Праблема эліпсіса ў функцыянальным аспекце ........ 75

**Літаратуразнаўства**

*Ганчарова-Цынкевіч Т. У.* Пытанні беларускага адраджэння ў цыкле вершаў “Старая Беларусь” Максіма Багдановіча ........ 81

**Гісторыя**

*Бяспалая М. А.* Да пытання аб сацыяльна-эканамічным стане прыгранічнай вёскі ў пачатку 20-х гадоў ........ 86

*Даніловіч В. В.* Вытокі арганізацыі “Змаганне” ........ 90

*Забаўскі М. М.* Нацыянальнае пытанне і палітычныя пазіцыі дэпутатаў ад Беларусі ў III Дзяржаўнай думе Расіі (1907—1912 гг.) ........ 97

*Адзярыха В. У.* Нацыянальны пакт і стварэнне ў 1943 г. Ліванскай Рэспублікі ........ 105

**Біялогія**

*Баўтута Г. А., Бучанкоў І. Э.* Біялагічныя асаблівасці гібрыдаў ад скрыжаванняў парэчкі з агрэстам ........ 110

*Бучанкоў І. Э., Нікіціна Т. М.* Вынікі аддаленай міжвідавой і міжрадавой гібрыдызацыі ў сямействе агрэставых (Grossulariaceae Dumort) ........ 113

**Матэматыка**

*Кабак Г. І.* Абагульнены адваротны аператар ад лінейнага мнагазначнага аператара ........ 116

**Рэфераты ........ 119**

**У саветах па абароне дысертацый ........ 124**

***Адрас рэдакцыі:***
220050, Мінск,
вул. Савецкая 18,
пакой 96,
тэл. 20-41-26

*Рэдактар* Н. І. Копысава

*Арыгінал-макет:* А. А. Пакала

Падпісана ў друк 29.06.98. Фармат 70×108 1/16. Папера афсетная. Афсетны друк.
Ум. друк. арк. 7,5. Ул.-выд. арк. 7,3. Тыраж 100 экз. Заказ 211.

Ратапрынт БДПУ імя М. Танка; 220050, г. Мінск, вул. Савецкая, 18.

© БДПУ імя Максіма Танка, 1998.

АРК

Мн., 1987. С. 217.

SUMMARY

*The general theoretical principles and ways of practical realization of ideas of aesthetic upbringing in Makarenko`s creative activity and in works of his followers are shown in the article. The peculiarities of their application are analyzed in the light of problem conception.*

УДК 370(09)

*І. І. Рыжыкава*

# ПЕДАГАГІЧНАЯ ПЕРЫЁДЫКА АБ МЭТАХ ПРАФЕСІЙНАЙ ПЕДАГАГІЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ (1918-1941 гг.)

Гісторыка-педагагічны аналіз тэорыі і практыкі педагагічнай адукацыі ў эпоху сацыяльных перамен мае вялікае значэнне ў справе рэфарміравання сістэмы вышэйшай педагагічнай адукацыі Рэспублікі Беларусь у канцы стагоддзя. Ён не толькі выяўляе заканамернасці працэсаў і з'яў мінулага, паказвае сувязі і залежнасці папярэдніх этапаў развіцця педагагічнай адукацыі з сучаснасцю, але і дапамагае з большай верагоднасцю прагназаваць будучае, супрацьстаяць кансерватыўным працэсам. Вынікі гісторыка-педагагічных даследаванняў у значнай ступені ўплываюць на пастаноўку новых метадалагічных праблем, садзейнічаюць сцвярджэнню дакладнай сістэмы каштоўнасцяў для практычных падыходаў па ажыццяўленні эксперыментаў рознай сацыяльнай шырыні.

Тэарэтычную і практычную і значнасць прадстаўляюць змест і маштабы педагагічнай перыёдыкі ў першыя паслярэвалюцыйныя дзесяцігоддзі. Пры даследаванні метадычных і педагагічных публікацый па праблеме фарміравання будучага настаўніка як творчай індывідуальнасці ў сістэме вышэйшай педагагічнай адукацыі ў 1918—1941 гг. мы шырока прымянялі метад кантэнт-аналізу. На першым этапе даследавання ажыццяўляўся рэтраспектыўны пошук матэрыялаў па праблеме падрыхтоўкі настаўніка, якія падвергліся затым квантаванню і фармалізацыі. У якасці адзінак квантавання былі ўзяты ідэал асобы настаўніка, ідэал паводзін, ідэал адукацыі, ідэал вучэбнай дзейнасці студэнтаў, вынікі творчасці. Фіксуемымі для ўсіх адзінак назірання прыметамі выступалі: 1) творчасць (творчы); 2) інтэнсіўнасць фіксуемай прыметы (якая падрабязна аналізуецца, проста асвят-

ляецца, адначасова ўпамінаецца).

Кантэнт-аналіз публікацый, прысвечаных праблеме падрыхтоўкі настаўніка, сведчыць, што перыяд стварэння новых адукацыйных каштоўнасцяў быў складаным і супярэчлівым, характарызаваўся нераўназначным уплывам асобных камунікатараў на тэорыю і практыку вышэйшай педагагічнай адукацыі.

Першыя паслярэвалюцыйныя гады — гэта час бурнага развіцця новай педагагічнай перыёдыкі. У 1917—1924 гг. дзяржаўнымі, грамадскімі арганізацыямі, а таксама прыватнымі асобамі выдавалася 314 педагагічных часопісаў.

Актывізацыя дзейнасці сродкаў масавай інфармацыі не была выпадковай. Так, рэдакцыя часоніса "Педагогическая мысль", звяртаючыся да педагагічнай грамадскасці, пісала: "З кожным днём становіцца ўсё больш зразумелым, што для ўзмацнення прававога ладу і барацьбы з разрухай і ўнутраным разлажэннем Расіі неабходна напружанне ўсіх духоўных сіл краіны і перш за ўсе поўнай рэарганізацыі народнай адукацыі ў прымяненні да новых умоў жыцця, адукацыі сямейнай і грамадскай, пазашкольнай і школьнай, агульнай і прафесіннай, ніжэйшай і вышэйшай" [1, с. 2].

Карэннае змяненне падыходу да ацэнкі ролі сістэмы народнай адукацыі ва ўсіх сферах жыцця грамадства актуалізавала праблему настаўніка і яго падрыхтоўкі. З 203 часонісаў, якія былі зарэгістраваны і ўпаміналіся ў "Педагогической библиографии", 21,6% перыядычных выданняў звярталіся менавіта да гэтай праблемы.

Значны ўклад у стварэнне і пашырэнне новых светапоглядных каштоўнасцяў у гэты перыяд унёс часопіс "Педагогическая мысль". Ён аб'яднаў у творчы саюз педагогаў-тэарэтыкаў і практыкаў, якія прадстаўлялі на яго старонках розныя кірункі ў педагогіцы і псіхалогіі. З часопісам актыўна і творча супрацоўнічалі М. М. Бахцін, В. Н. Бейер, А. П. Балтуноў, В. П. Вахцераў, Е. М. Іарданская, П. Ф. Капцераў, С. А. Астрагорскі, А. І. Каніца, А. П. Пінкевіч, Б. Я. Райкоў, Р. І. Рассаліма, І. В. Эвергетаў, II. А. Эфрусі і многія іншыя.

Асноўную сваю думку творчы калектыў гэтага грамадска-педагагічнага выдання бачыў у распрацоўцы канцэпцыі стварэння мадэлі адзінай дэмакратычнай школы, моцнай духам грамадскасці і здольнай даць радзіме карысных працаўнікоў у разумовай галіне і ў сферы фізічнай працы.

Часопіс найбольш часта звяртаўся да праблемы творчасці настаўніка. Педагагічная думка на старонках гэтага выдання пульсавала ў наступных катэгорыях: сучасны настаўнік — гэта "транслятар культурнага матэрыялу", "выхавальнік творцаў новага жыцця, новых культурных каштоўнасцяў, прадаўжальнікаў культуры", "фактар прагрэсу"; "стваральнік сваёй, дарагой яму,

аўтаномнай школы"; "гуманіст"; "творца-змагар", які здольны адстойваць моцнага, актыўнага чалавека, натхняць яго на упартую працу і барацьбу за лепшае будучае чалавецтва, імгненна рэагаваць на ўсе з'явы жыцця, "арганізатар радасці", "супрацоўнік вучня" настаўнік "задавальняе патрэбнасці асобы да творчага пазнання", "запальвае ў выхаванцах прагу пазнання і творчасці".

У пачатку 20-х гадоў шырока абмяркоўвалася пытанне аб крытэрыях вызначэння творчай асобы настаўніка. Дамінуючая навукова-педагагічная лексіка часопіса "Педагогическая мысль" сведчыць, што якасці творцы і грамадскага работніка, творцы і сацыяльнага арганізатара прадстаўляюцца ўзаемазвязанымі. Педагагічная грамадскасць была адзінай у поглядзе: ствараць новыя каштоўнасці здольны толькі чалавек, якому ўласцівы высокія грамадскія ідэалы.

З мэтай развіцця грамадскай думкі ў дадзеным напрамку са снежня 1920 г. пачаў выходзіць часопіс "Работник просвещения" — орган Цэнтральнага Усерасійскага Саюза працаўнікоў асветы і сацыялістычнай культуры. Характэрнай асаблівасцю выдання з'явілася імкненне актыўна уплываць на змяненне зместу педагога як грамадскага работніка. На аснове таго, што школа ва ўмовах дыктатуры пралетарыяту "праваднік не толькі прынцыпаў камунізму, але і... ідэйнага, арганізацыйнага, выхаваўчага уплыву пралетарыяту на паўпралетарскія і непралетарскія слаі працоўных мас у мэтах выхавання пакалення, здольнага канчаткова устанавіць камунізм" [2, с. 3], рабілася наступная выснова: настаўнік — гэта грамадскі, палітычны дзеяч і спецыяліст асветнай работы [3, с. 1].

У дыскусіі пра настаўніка, які актыўна ўдзельнічае ў сацыяльнай творчасці, супрацоўнікі часопіса А. Б. Залкінд, А. Г. Калашнікаў, В. М. Шульгін і іншыя часта выкарыстоўвалі наступныя азначэнні: "настаўнік — палітработнік", "грамадскі школьны работнік", "рэвалюцыянер", "прапагандыст", "асветнік", "рэвалюцыйны сацыяльны баец", "паслядоўны матэрыяліст, правадыр і ўзор для чырвонай дзіцячай арміі, рэвалюцыйны арганізатар шырокіх працоўных мас".

Прапаганда тыпу педагога, які актыўна ўдзельнічае ў грамадска-палітычным жыцці краіны, вялася і іншымі выданнямі. Артыкулы і выступленні на дадзеную тэму мелі ў друку самыя вялікія тыражы. Напрыклад, прамова Р. Зіноўева "Пралетарская рэвалюцыя і настаўніцтва" ў 1924 г. была надрукавана асобным выданнем тыражом 58 тыс. экз. і змешчана ў часопісах "Народный учитель" і "Дело просвещения". Лекцыя В. А. Ключэўскага "Настаўнік і кааперацыя" мела тыраж 20 тыс. экз., твор Н. К. Крупскай "Калектыўная праца настаўніцтва" — 8 тыс. экз.

Паказальны ў гэтам плане конкурс на лепшага настаўніка года, які быў аб'яўлены НКА і газетай "Правда" ў красавіку-маі 1923 г. Пра ўмовы конкурсу "Правда" пісала: "Калі ваш настаўнік змог у надзвычай цяжкіх умовах зберагчы школу, калі ваш настаўнік клапоціцца аб добраўпарадкаванні школы, калі ваш настаўнік звязвае працу школы з вытворчасцю, яе акружэннем, калі, акрамя таго, прымае актыўны ўдзел у грамадскім жыцці, змагаецца з рэлігійнымі забабонамі, дапамагае пазбавіцца ад самагону і п'янства, дапамагае вам наладзіць і арганізаваць работу каапературыва і арцелі, паказвае лепшыя спосабы вядзення сельскай гаспадаркі, ваш настаўнік — лепшы настаўнік... Яго павінна знаць уся рэспубліка" [4].

На працягу двух месяцаў "Работник просвещения" і іншыя выданні асвятлялі конкурс. Распавядаючы пра лепшых настаўнікаў, партыйных і беспартыйных, часопісы сцвярджалі ў свядомасці педагагічнай грамадскасці прыклады самаадданага служэння сваёй справе, гуманізму, творчага падыходу да арганізацыі і устанаўлення новых форм жыцця.

Часопіс "Работник просвещения" адыграў вялікую ролю і ў папулярызацыі ідэі аб вывучэнні працы настаўніка. У пачатку 20-х гадоў па ініцыятыве дзяржавы былі створаны цэнтры, якія займаліся гэтай праблемай: Камісія па вывучэнні працы настаўніка пры Цэнтральным педагагічным інстытуце (1920), Лабараторыя па даследаванні сутнасці педагога пры Інстытуце імя У. А. Обуха (1923) і інш. Прафесіёграфы выкарыстоўвалі часопіс як трыбуну для асвятлення вынікаў сваёй працы і ініцыіравання даследаванняў у напрамку вывучэння творчага характару працы настаўніка. У 1923 г. А. С. Шафранава апублікавала карту дэталёвай прафесійнай характарыстыкі працы настаўніка. Сутнасць праграмы заключалася ў вызначэнні ўмоў і фактараў (знешніх і ўнутраных), якія дазваляюць педагогу працаваць творча.

Праблема творчасці настаўніка вырашалася неадназначна і іншымі камунікатарамі. Усё залежала ад светапоглядных установак аўтараў. Якасны аналіз матэрыялу паказаў, што да 1930 г. праблема метадычных каштоўнасцяў у вышэйшай школе не рашалася ў поўным аб'ёме.

Грамадска-педагагічная навуковая перыёдыка 20-х гадоў давала светапоглядныя арыенціры пошуку інавацыйных форм і метадаў вучэбнага працэсу. Дзякуючы дзейнасці часопісаў "Педагогическая мысль", "Народное просвещение", "Научный работник", "Педагогическая квалификация" шырокі рэзананс атрымалі ідэі цэласнасці і непадзельнасці асобы, актыўнай арудыйна-знакавай прыроды душэўных сіл, вышэйшых псіхічных функцый і здольнасцяў чалавека; аперцэптыўнага характару набыцця любога вопыту; пластычнасці (зменлівасці) усіх асобас-

ных уласцівасцяў, развіцця душэўных сіл у ходзе і ў выніку ўзаемадзеяння прыроджаных праграм росту і развіцця з акаляючым чалавека светам прыроды, рэчаў, сацыяльных установак, са светам культуры; вопыце як першай і апошняй крыніцы пазнання; узаемаабумоўленасці выхаваўчага і адукацыйнага ўплыву ў сістэме "асоба—грамадства" і інш.

Дэцэнтралізацыя кіравання педагагічнай навукай і звязаная з ёю свабода эксперыментавання, адносная аўтаномнасць педагагічных вучэбных устаноў, свабода выдавецкай дзейнасці, якая існавала ў першыя гады савецкай улады, — усё гэта садзейнічала ўстанаўленню супрацоўніцтва ў сістэме Наркамасвета—навука—ВНУ—сродкі масавай інфармацыі. Дэмакратычныя адносіны ў сістэме вышэйшай педагагічнай адукацыі выступалі надзейным гарантам непрымання ўсяго, што супярэчыла практыцы падрыхтоўкі настаўніка да творчасці.

Так, у сярэдзіне 20-х гадоў на старонках часопіса "Научный работник" разгарнулася дыскусія пра "сапраўдную вышэйшую школу". Скіраванне універсітэцкай рэформы ў бок школы-вучобы, вузкай прафесіяналізацыі навуковай грамадскасцю крытыкавалася як недасканалае і нават шкоднае. Уяўленні аб вышэйшай школе як школе "вышэйшых навуковых ведаў" падводзілі ВНУ і НДІ да неабходнасці ажыццяўлення рэформ у двух кірунках: стварэння ў ВНУ атмасферы творчасці праз уключэнне ўсіх суб'ектаў у навукова-даследчую працу і ўзмацнення навукова-даследчага элемента ў вучэбным працэсе.

Важнасць навукова-даследчага кампанента ў выкладанні тлумачылася патрэбамі народнай гаспадаркі, культуры, інтарэсамі асобы, а таксама навукі. Менавіта навукова-даследчы элемент абумоўліваў сабой высокую кваліфікацыю тых, хто закончыў ВНУ і каго чакала дзяржава. Добрым спецыялістам аб'яўлялася асоба, якая пры дапамозе сваёй адукацыі магла здзейсніць сваю творчую ініцыятыву. Для гэтага яна павінна быць навукова адукаванай: валодаць неабходнымі ведамі, умець іх прымяняць у жыцці, кіравацца імі ў сваёй арганізацыйнай дзейнасці, пашыраць іх разам з развіццём навукі, валодаць метадамі навукова-даследчай працы. Работнікі вышэйшай школы М. С. Дзяржавін, І. І. Салосін адзначалі, што адукацыя спецыяліста не павінна прычыняць шкоду інтарэсам "самастойнай калектыўнай асобы", развіцця яе навукова-метадычнага мыслення. Навукова-даследчы элемент выкладання з'яўляўся тым неабходным стымулам, які дапамагаў выяўляць у студэнцкім асяроддзі індывідуальнасці з навукова-творчымі здольнасцямі і інтарэсамі. Нарэшце, захапленне меркантыльна-утылітарнымі поглядамі на навуку і яе выкладанне небяспечна для самой навукі, яе развіцця. Няправільна зразумелы утылітарызм ператварае мастацтва выкладання ў рамяство, а вучонага — у вузкага практыка.

Да сярэдзіны 30-х гадоў усе дыскусіі па пытаннях арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу ў ВНУ асвятляліся ў прэсе.

Наша даследаванне сведчыць, што па працягу 1917 – 1941 гг. творчасць у прафесійнай дзейнасці настаўніка і вучэбнай дзейнасці студэнта розныя камунікатары ўключалі ў сістэму педагагічных каштоўнасцяў. Але колькасць артыкулаў, якія раскрывалі метадалагічныя асновы прафесійнай творчасці, істотна адставала ад патрэбнасцяў практыкі вышэйшых навучальных устаноў. Аднак гэта не сведчыць аб адсутнасці патрэбнасці ў фарміраванні творчага настаўніка.

Пры адсутнасці новай тэорыі выхавання і навучання важна было трактаваць перш за ўсё пытанні філасофіі і педагогікі, агульныя праблемы дыдактыкі і тэорыі выхавання, псіхалогіі навучання і выхавання, тэарэтычныя пытанні прыватных методык.

Адзначым, што калектывы ВНУ адчувалі цяжкасці практычна на ўсіх этапах арганізацыі вучэбна-творчай дзейнасці. Абставіны змяніліся ў сувязі з выхадам часопіса "Педагогическое образование". На працягу 1933 – 1937 гг. гэты часопіс выконваў функцыю стымулявання педагагічных ВНУ да навукова-даследчай працы з мэтай вывучэння педагагічнага працэсу. Менавіта на перыяд выдання часопіса прыпадаў пік творчай актыўнасці педагагічных ВНУ ў праграмна-метадычнай рабоце, рост публікацый, якія закраналі праблему падрыхтоўкі студэнтаў педагагічных ВНУ да творчасці. З перадачай функцый часопісу "Советская педагогика" сітуацыя ўскладнілася.

К пачатку 1941 г. рэзка скарацілася колькасць педагагічных часопісаў, у якіх знаходзіла адлюстраванне праблема настаўніка. Да 1936 г. канцэпцыя падрыхтоўкі настаўніка, пытанні ўдасканалення вучэбна-метадычнага працэсу асвятляліся прыкладна ў 9-15 цэнтральных часопісах. У 1936 г. такіх часопісаў выходзіла толькі 4 (усе ўрадавыя). А з 1939 г. функцыю дапамогі педагагічным інстытутам і тэхнікумам у праграмна-метадычнай, арганізацыйнай і палітыка-выхаваўчай рабоце выконваў толькі часопіс "Советская педагогика".

Паводле задумы выдаўцоў часопіс "Советская педагогика" павінен быў стаць цэнтрам навукова-педагагічнай думкі ў краіне і аб'яднаць педагагічную грамадскасць вакол няспыннай і ўпартай барацьбы за савецкую школу, за далейшае развіццё савецкай педагагічнай навукі, за авалоданне педагагічнымі кадрамі асноў марксізму-ленінізму, тэхнікай сваёй справы. Аднак у тых умовах, якія скламіся, асвятляць аператыўна і ўсебакова пытанні асобы і творчасці не было магчымасці.

Такім чынам, шырокая і глыбокая дыскусія ў 1918 – 1941 гг. адлюстроўвала складаны і супярэчлівы працэс фарміравання новай парадыгмы педагагічнай адукацыі, які быў арыентаваны на развіццё творчай асобы настаўніка. Можна сцвярджаць, што

да першай трэці XX ст. склалася аптымальная мадэль узаемадзеяння прадуцыруючых (навуковая дзейнасць у сферы вышэйшай педагагічнай адукацыі, вопыт працы шэрага педагагічных вышэйшых навучальных устаноў, якія з'яўляліся навукова-эксперыментальнымі пляцоўкамі, напрыклад, АКВ, 2-іг МДУ, Вяцкі педінстытут імя Леніна, Педагагічны інстытут імя Герцэна і інш.), санкцыянуючых (Наркамасветы, Галоўпрафасветы, ГУС, ВКВШ) і рэзаніруючых (педагагічная перыёдыка) суб'ектаў сістэмы вышэйшай педагагічнай адукацыі.

### *Літаратура*

1. От редакции // Педагогическая мысль. 1918. № 1-2. С.2.
2. О наших "производственных" задачах // Работник просвещения. 1920. № 1. С.3.
3. От редакции// Работник просвещения. 1920. № 1. С. 1.
4. Правда. 1923. 24 марта.
5. *Державин Н. С.* К вопросу о методах преподавания в высшей школе // Научный работник. 1926. № 5/6. С. 37-51.
6. *Державин Н. С.* О повышении квалификации оканчивающих высшую школу// Научный работник. 1926. № 9. С. 63-72.

### *Summary*

***The conditions of Higher Pedagogical Education Formation of the teacher's creative personality in the age of social changes have been analysed. The object of the research wasthe projection of Pedagogical Institution's didactic process during 1918-1941. The role jf disserent communicators have been chown in the pedagogical appreciations system formation.***

УДК 741:152.27

*В. А. Сілівон*

## Недыз'юнктыўная прырода творчага працэсу ў маляванні дзіцяці

Тварэнне (як працэс) прадстаўляе, на наш погляд, адзін з універсальных законаў існавання Сусвету, які выяўляе спосаб яго пастаяннага аднаўлення, развіцця, змянення і пераўтварэння. У гэтым сэнсе развіццё ёсць толькі адна з форм праявы гэтага закону.

Здольнасць і патрэба да творчасці, пераўтварэння і стварэння прынцыпова новага, у тым ліку і рукатворнага свету ва ўсіх яго разнавіднасцях — прэрагатыва выключна чалавечая. Чала-